УДК 808.26(091):801.22

**С.І. Жураўлёва**

# Асаблівасці ўжывання склонавых форм назоўнікаў у "Траянскай гісторыі" пачатку XVII ст.

Назоўнікам, якія ўжываюцца ў "Траянскай гісторыі" пачатку XVII ст. [1], у цэлым характэрны тыя ж рысы, што і ў сучаснай беларускай мове. Як і ў літаратурных творах нашага часу, у помніку сустракаюцца агульныя, уласныя, канкрэтныя, абстрактныя, адушаўлёныя, зборныя назоўнікі. У марфалагічных адносінах яны характарызуюцца наяўнасцю катэгорый роду, ліку і склону.

У назоўным склоне адзіночнага ліку назоўнікі мужчынскага роду з былымі асновамі на -ŏ, й звычайна маюць у "Траянскай гісторыі" нулявы канчатак. Пры цвёрдай аснове пасля канцавой зычнай, калі яна не выносіцца над радком, пішацца ъ, пры мяккай – ь: *уведал теж то и брат его; поразивши вепръ медведицу а втягнулъ ю до обозу; встыдъ великий буде наопосле; был теды в Грецеи муж знакомитий; Приям царъ отецъ его шол до обозу; царъ Гекторъ сынъ приямов ижъ одным з лука огненнымъ пострелом затоплял трох кораблей* [1].

Назоўнікі ніякага роду з былой асновай на ŏ ўжываюцца з канчаткамі -о, -е. Афармленне гэтага разраду слоў пры дапамозе абодвух канчаткаў адзначаецца ў шматлікіх выпадках: *з однои стороны прилежит море; запалили место; прилежит пелешино море або озеро великое; все грецкое рицерство плакало* [1]. Назоўнікі з былой асновай на зычны маюць канчатак -я: *детя а звлаще играючи силу в собе оказало* [1].

Як сведчыць змешчаны ў помніку матэрыял, назоўнікі жаночага роду з асновай на -ă маюць канчатак -а/-я: *засточилася битва; пришла година роженю; жона теж его принесла сына; родичка не хотела его стратит; царица Елена змовилися з собою; если царъ Агеменъ дасть ей дочку Цветану ускромится хвиля* [1]. Назоўнікі жаночага роду з асновай на ĭ ўжываюцца без канчаткаў: *пришла ведомост Менелаю цареви; заиност моя не есть мила брату; смелост болшая припала* [1].

Названыя формы назоўнага склону дайшлі да нашага часу і шырока ўжываюцца ў пісьмовай практыцы і маўленні.

У родным склоне назоўнікі мужчынскага роду афармляюцца пры дапамозе канчаткаў -а/ -я (ад асноў на -ŏ) або -у/-ю (ад асноў на й). Сфера ўжывання гэтых флексій залежыць ад прыналежнасці назоўнікаў да пэўных граматычных катэгорый і семантычных груп. Канчатак -а/-я маюць назоўнікі мужчынскага роду, якія абазначаюць асоб і жывых істот, канкрэтныя прадметы: *шол до отца своего; шол до пастыря; бегла до вепра; упавши до корабля борздого убежал* [1]. Канчатак -у/-ю выступае ў назоўніках мужчынскага роду з абстрактным значэннем: *не было взгляду на особы; от страху твоего естем мертвый;* са значэннем месца: *не было жадного дому; послал до обозу; вшла до огороду; яблоко оное вкинут до саду; не хотели з собою бою учинити* [1].

Размеркаванне канчаткаў -у/-ю і -а/-я адбываецца не столькі ў залежнасці ад тыпу асновы, колькі ад семантычных катэгорый. Такі падыход назіраецца і

сёння.

Вельмі паслядоўна адлюстраваны ў "Траянскай гісторыі" назоўнікі ніякага роду (аснова на -ŏ) з канчаткам -а/-я: *вышла з Трои места, а з греческого войска вепрь; учинили коня з дерева; три мере золота; з моря пустилися искри; вышла з Трои места* [1].

Для назоўнікаў жаночага роду з асновай на -ă характэрны пры цвёрдай аснове канчатак -ы, пры мяккай - и: *заплыв до некоторои выспы; от жоны своеи правды доведал; не было личбы; сплеталъ венецъ з оливы* [1].

Назоўнікі жаночага роду з былой асновай на ĭ маюць канчатак -и: *жадноu прикрости выражати не починали; муровалъ ажъ до смерти своей; абы чужая вдячност не отобрала учтивости нашои* [1]. Сустракаецца варыянт -ы, калі аснова слова заканчваецца на ц: *боявся ахиллеевы моцы* [1].

Адзначаныя формы характэрны і для сучаснай беларускай мовы.

У давальным склоне назоўнікі мужчынскага і ніякага роду маюць канчатак -у: *зацност моя не есть мила брату моему; аж попу дочку воротит мусили; пришол от бога час загинути месту; мяновали Ахиллея евфриянского царя всему рицерству гетманом* [1]. Давальны склон назоўніка конь афармляецца канчаткам -еви: *дивовалися оному коневи* [1].

Назоўнік жона жаночага роду (з асновай на -ă) ужываецца з канчаткам е: *царъ Приям росказал жоне* [1].

У вінавальным склоне адушаўлёныя назоўнікі мужчынскага роду маюць форму агульную з родным склонам: *Фариж упросил отца Прияма; милого приятеля невинне забили; не пущал на войну Гектора сына своего* [1]. Назоўнікі, якія абазначаюць неадушаўлёныя прадметы, маюць форму агульную з назоўным склонам: *сплеталъ венецъ з оливы; в денъ завтрешний не пущал не войну Гектора; выносил каменъ; деточок маленкихъ о муръ розбияно; уподобал собе царъ оный островъ*.

Назоўнікі ніякага роду супадаюць па форме з назоўным склонам: *княжа чинил веселье; учиню тобе имя новое; греков яко колосе пожинали; упала на море; учинили примире на два дни* [1].

Назоўнікі жаночага роду (аснова на -ă) паслядоўна выкарыстоўваюцца з канчаткам -у/-ю: *не возмете Трои места през войну; Нептенабуш понырал в воду; царъ Гекторъ чинил валку през вси дни; породила вместо детяти головню; народ секли и в неволю брали* [1]. Словы, якія адносіліся раней да асновы на -ĭ, маюць у помніку форму назоўнага склону: *стали вси беспечне през ночъ оную спати; почал песокъ орати а соль сеяти* [1].

Для назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду (аснова на ŏ, й̆) характэрны ў творным склоне канчатак -омъ/-емъ. Варыянт -омъ выкарыстоўваецца пры напісанні назоўнікаў з цвёрдай асновай, а -емъ – з мяккай асновай. Гэтыя канчаткі сустракаюцца ў націскной і ненаціскной пазіцыі: *мяновали Ахиллея всему рицерству гетманом; Трою место збудавал широшим муром; лепей бых зезволил з бесным псом през три лета бегат; Менелай зобравшися з войском великим ишол на него; пробил его копьемъ из коня; казали сына его перед ралом положити* [1].

Назоўнікі жаночага роду (аснова на -ă) ужываюцца ў творным склоне з канчаткам -ою. Гэта пацвярджаецца шматлікімі напісаннямі тыпу *мерою, стрелою: онъ ихъ жадною мерою не услухал; устремил его в самую пяту ядовитою стрелою* [1].

У творным склоне назоўнікі з асновай на -ĭ, заканчваюцца на -ю: *абым учтил великую зацностю твою велможност; Фариж з великою радостю шол до мниманого отца своего* [1].

Пры афармленні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду (асновы на -ŏ, -й̆) выкарыстоўваюцца ў месным склоне канчаткі -е, -и, -ю. Канчатак -е знаходзіць

пашырэнне ў назоўніках з цвёрдай асновай: *в каждой игре и вытечце не был ему жадный подобным; голову утяли на гробе Ахиллееве; замкнувшиеся в месте при мурах седели* [1]. Назоўнік камень з мяккай асновай ужываецца з канчаткам -и: *не зосталъ камен на камени* [1]. Назоўнік конъ мае канчатак -ю на месцы традыцыйнага -е/ -и/: *рицерство грецкое было в коню* [1].

Назоўнікі жаночага роду з цвёрдай асновай выступаюць з канчаткам -е: *ходилъ самъ на вере до места* [1]. Для назоўнікаў з мяккай асновай характэрны канчатак -и: *в земли жидовской былъ въ елинех царъ; нашол его на постели; обачили трояне же на пристани человека* [1]. У тэксце трывала захоўваюцца правапісныя традыцыі, пагэтаму пасля шыпячых таксама ўжываецца канчатак -и: *нашол детя оное на пущи* [1].

У тэксце помніка адзначаецца некалькі назоўнікаў мужчынскага роду ў клічнай форме: *будь брате мой веселым; о сыне вспомни однакъ на мои болести* [1].

У назоўным склоне множнага ліку назоўнікі мужчынскага і жаночага роду афармляюцца пры дапамозе канчатка -ы пры цвёрдай аснове, -и пры аснове на мяккі зычны і к: *я есть веселым кгдысмы есть самовладцы; трояны осмелилися; богини оныи нашли яблоко; зашли ему тройскии пании; греки оточили трою* [1].

Неабходна звярнуць увагу на форму жаночага роду з асновай на р. Як адзначае А.М. Булыка, у беларускіх пісьмовых крыніцах XVI ст. у сувязі з зацвярдзеннем шыпячых, ц і р у становішчы пасля іх знаходзіць пашырэнне новы канчатак -ы. Праўда, ужыванне яго не было паслядоўным, бо па традыцыі ў помніках пісьменнасці часта выкарыстоўваўся і стары канчатак -и [2]. Гэту з'яву заўважаем і ў "Траянскай гісторыі": *з моря пустилися искри* [1].

Прадстаўлены ў помніку лексемы мужчынскага роду з канчаткам -овъ у родным склоне: *Ектор выбил семъ полков* [1]. Ад асновы на ĭ узяты канчатак -ей: *затоплял трох кораблей* [1].

У назоўніках жаночага роду (аснова на -ă) у родным склоне захавалася форма з нулявой флексіяй: *з трех тых богин; мати, жена и сестри паненокъ тех поривано несчадно* [1].

Неадушаўлёныя назоўнікі мужчынскага і жаночага роду ў вінавальным склоне маюць агульны з назоўным склонам канчатак -ы/-и: *чинил валку през вси дни; хотячи вси корабли потопити; чинил наезды греком Ектор; головы пооттинати казал; уфатилися за руки; напустил хоробы на грецкии войска* [1]. Шырока распаўсюджаны канчатак -и ў назоўніках на заднеязычны: *все места и замки бурили; поразбивал имъ полки; сплеталъ венецъ и вкладал имъ на роги* [1].

У назоўніках ніякага роду заўважаецца, як і ў назоўным склоне, канчатак -а / -я: *ему прислал войска; поплюскали вси поля индейскою кровю* [1].

Назоўнікі мужчынскага роду ў творным склоне шырока ўжываюцца з канчаткамі -ами, -ями: *греки оточили Трою кораблями; з обозами утекат хотели; потоками кровий розливали; Фариж з слугами поспешившися, ухватил царицу* [1].

Асабліва многа ў "Траянскай гісторыі" выпадкаў фіксацыі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду ў месным склоне з канчаткам -ахъ/-яхъ, пашыраным пад уздзеяннем асноў на ă: *пришол до него играючи жалосно на гуслях; приплыли в кораблях до Трои; при мурах седели; мелъ ласку в очах; понесу на плечахъ своих* [1].

Праведзены аналіз паказаў, што, нягледзячы на захаванне традыцый папярэдняга перыяду пісьменнасці [3], мова "Траянскай гісторыі" ў многіх адносінах у галіне скланення назоўніка набліжалася да жывой народнай мовы. Гэта збліжэнне ішло па шляху спрашчэння тыпаў скланення і уніфікацыі склонавых флексій.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Траянская гісторыя пачатку XVII ст.*** Рукапіс Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына, F. XVII. 5, лл. 67-72.
2. ***Мова беларускай пісьменнасці XIV-XVIII стст.*** / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко, У.М. Свяжынскі. Мн.: Навука і тэхніка, 1988. С. 65.
3. ***Булыка А.М., Жураўскі А.І., Крамко І.І.*** Гістарычная марфалогія беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1979. - 328 с.



## *S U M M A R Y*

*The article deals with the analysis of noun cases in "Troyan story". The scientific work proves the idea that the formation of the system of word-changing of nouns goes through the simplification of types of declension and the unification of declension endings.*